**Старшыням абласных, раённых Радаў БНФ**

**Шаноўныя калегі!**

Падчас справаздачна-выбарчай кампаніі ў шэрагах БНФ на пачатку 1997 г. просім вас ~~дзеля больш эфектыўнай дзейнасьці нашай арганізацыі~~ зьвярнуць увагу на наступныя моманты.

1. Правесьці ~~справаздачна-выбарчыя~~ сходы ў суполках да ~~31 студзеня~~ 1997 г. з абавязковым вылучэньнем упаўнаважаных у Рады БНФ, у Радах – да 10 лютага.

На сходах абмеркаваць перспэктыўныя кірункі дзейнасьці суполак, Радаў і ўвогуле Фронту і вылучыць найважнейшыя як для мясцовых структураў, так і для кіраўніцтва Фронту. Найцікавейшыя і абагульненыя прапановы пісьмова перадаць ва Ўправу Фронту.

2. Запоўніць і прывезьці ва Ўправу (ці даставіць праз кур'ера) пашпарты на кожную суполку і ~~раённую~~ раду да 10 сакавіка 1997 г. Узоры пашпартоў прыкладаюцца.

3. У адвольнай форме даць пералік галоўных акцыяў раённай Рады за 1996 г. і іхныя вынікі.

4. Для далейшай дзейнасьці неабходна ўзмацніць суполкі Народнага Фронту. Дзеля гэтага неабходна, каб суполкі ахоплівалі тэрыторыю усёй краіны. Канчатковая мэта – стварыць суполку на кожным выбарчым участку ~~(сёньня гэта магчыма толькі ў Менску і некаторых іншых гарадах)~~.

5. Неабходна мець адказных за найважнейшыя кірункі працы ў раённых радах (праца з моладзьдзю, культура, абарона правоў чалавека, сацыяльныя ініцыятывы, спорт, школьніцтва, падпіска, сувязь з прафсаюзамі і г.д.). Пры патрэбе – кантактаваць з адпаведнымі структурамі ў Менску:

а) *Моладзь*. Сакратар Управы БНФ Уладзімер Несьцер (х.т.262-39-45), старшыня Маладзёвай арганізацыі БНФ ~~Алесь Касач~~ (х.т.239-72-45). Паседжаньні шточацьвер у сядзібе БНФ.

б) ~~*Патрыятычна-спартовая праца*~~. *Дружына*. Сакратар Управы БНФ ~~Анатоль~~ Крываrот (т.х.237-33-80).

в) *Культура*. ~~Сакратар Управы~~ БНФ Мікола Купава (т.майст.231-32-59).

г) *Парушэньні правоў чалавека*. Беларускі Хельсінскі Камітэт.
г. Менск, вул.Кнорына, д.8, кв.23, т.266-26-91. Пра ўсе дапушчаныя парушэньні абавязкова пісаць заявы ў адвольнай форме на імя старшыні БХК сп-ні Процькі Тацяны Сяргееўны, але перадаваць іх абавязкова праз Управу БНФ.

д) *Моўныя праблемы.* Таварыства Беларускай Мовы. г.Менск, вул.Румянцава,13, т.233-25-11.

е) *Змаганьне за беларускамоўнае навучаньне*. Таварыства Беларускай Школы. т.х.266-58-87, Івашкевіч Віктар.

ж) *Стварэньне ды існаваньне грамадзкіх арганізацыяў.* Цэнтар Супольнасьць, т.237-37-38.

з) *Свабодны прафсаюз.* г.Менск, пл.Свабоды, 23, т.227-04-54.

і) *Грамадзкі кабінэт міністраў БНФ*. Бельская Сьвятлана Іосіфаўна, т.х.220-63-08.

6. Даслаць плян акцыяў на наступны год да 1 сакавіка 1997 г. Абавязкова прадугледзець адзначэньне нацыянальных сьвятаў мітынгамі, шэсьцямі (у буйных гарадох), пікетамі (у райцэнтрах), вечаровымі культурнымі праграмамі. Заплянаваць правядзеньне пікетаў пад сацыяльнымі (супраць падвышэньня коштаў, малых заробкаў і пэнсіяў ды іх затрыманьня ў выплаце, адсутнасьці прадуктаў харчаваньня і г.д.) і незалежніцкімі лёзунгамі. Пасьля правядзеньня акцыяў тэрмінова паведамляць (пад запіс дзяжурнаму) ва Ўправу БНФ і ў мясцовы незалежны друк.

7. Важнейшымі зьяўляюцца масавыя акцыі ў Менску, якія будуць адбывацца:

а) падчас магчымага агульнага паседжаньня расейскай думы і лукашэнкаўскай палаты прадстаўнікоў;
б) пры зьяўленьні новых канфэдэратыўных ініцыятываў А.Лукашэнкі;
в) падчас нацыянальных беларускіх сьвятаў.

На гэтыя выпадкі прадугледзець мабілізацыю як мага большай колькасьці людзей у Менск. Абавязкова ўвязваць гэтыя акцыі з акцыямі ў вашых гарадох.

8. Інфармацыйная палітыка. Шчыльна кантактаваць з усімі мясцовымі недзяржаўнымі газэтамі і кабельнымі тэлеканаламі. Даваць інфармацыю ў газэты "Свабода", "Пагоня", "Народная воля", "Наша Ніва". Акрамя ўсяго, кожная Рада павінна мець магчымасьць набраць, змакетаваць, аддрукаваць невялікім накладам мясцовыя інфармацыйныя і агітацыйныя матэрыялы. Дзеля гэтага, калі неабходна, кантактаваць зь мясцовымі грамадзкімі арганізацыямі або нават спэцыяльна зарэгістраваць грамадзкую арганізацыю, якая можа здабыць грант на кампутар і капіравальную тэхніку.

---

***Дарагія сябры! На Вашай ахвярнай працы трымаецца Фронт, а значыць, трымаецца Беларусь. Нягледзячы на ўсе нягоды, мы пераможам. Жыве Беларусь!***

Сакратарыят Управы БНФ.